*Алег Аляхновіч*

## АЎТЭНТЫЧНЫЯ НАРОДНЫЯ СПЕВЫ Ў СВЯЦЕ

Свята стварае спрыяльныя ўмовы для выкарыстання народнай манеры спеваў, якая яшчэ недастаткова даследавана ў тэарэтычным і практычным аспектах. З пункту гледжання тэорыі паняцце «аўтэнтычная манера спеваў» уключае тыпы (віды), ў якіх яна праяўляецца (дыханне, гукаўтварэнне, дыкцыя, артыкуляцыя і інш). Складанасць вывучэння гэтай праблемы падкрэслівалі рускія даследчыкі Д.Пакроўскі, Н.Мяшко і інш. Узнікае пытанне: а ці існуе ўвогуле ў натуральным асяроддзі «школа народных спеваў?» Вядома, у сучасным разуменні цяжка ўявіць сабе існаванне падобнай «школы». Але асноўныя прынцыпы народных спеваў, канешне, усведамляюцца ўсімі, хто мае дачыненне да выканання народнай песні, пачынаючы з вызначэння самаго паняцця «гурт» як аб'яднання групы спевакоў [3, с. 312].

Народныя гурты заўсёды напярэдадні абрадаў, свят праводзілі своеасаблівыя рэпетыцыі, вызначалі творы, якія планавалі выконваць, падбіралі ўдзельнікаў святочных дзей, вызначалі функцыю кожнага ў гурце, рыхтавалі абрадавыя «ролі», касцюмы, адзенне для пераапранання ў пэўныя персанажы. Удзельнікі, якія валодалі дрэнным голасам і не мелі добрага музычнага слыху, не ўключаліся ў гурт. У народзе заўсёды адносіліся з павагай да тых, хто добра спяваў, прыслухоўваліся, як яны «цягнуць» песню, аздабляюць яе мелодыю разнастайнай рытмікай, «арнаментам». Адзначанае сведчыць аб існаванні пэўнай «школы народных спеваў».

Нельга не адзначыць, што наша музычная адукацыя арыентуецца на агульнаеўрапейскую ці рускую манеру выканання з іх раздзяленнем галасоў на сапрана, альты, тэнары і басы. У народзе так ніколі не спявалі і не спяваюць, хаця вытокамі акадэмічных спеваў з'яўляюцца народныя песенныя традыцыі. Арыентацыя на прафесійнае выкананне народных песень, дрэннае веданне асноў народных спеваў, нежаданне некаторых кіраўнікоў фальклорных калектываў, асобных выканаўцаў, асабліва народных хароў, вучыцца зрабілі іх, па сутнасці, *псеўданароднымі*. Іншыя выканаўцы зусім не задумваюцца над творчай інтэрпрэтацыяй народнай песні, пачынаюць яе «ўдасканальваць», «аздабляць». У выніку наносяць шкоду песеннай традыцыі, у прыватнасці, абрадавым творам, якія нельга апрацоўваць.

Нярэдка ў святах можна ўбачыць і пачуць пры выкананні народных песень шмат неапраўданай весялосці, моцнага гуку, крыку, танцаў, што не адпавядае прыродзе народнай манеры выканання і характару фальклорных твораў: у іх, напрыклад, роздум і сум, а на сцэне - прытанцоўкі і выкрыкі. Іншымі калектывамі вельмі мала выконваецца спакойных, лірычных песень, балад, драматычных твораў, што збядняе народную манеру выканання. Многія гарадскія народныя хары паказваюць адсутнасць добрага мастацкага густу, павярхоўныя адносіны да народнай песні.

Аналіз навуковай літаратуры і ўласны шматгадовы вопыт работы аўтара з фальклорнымі калектывамі дазваляе вызначыць два віды народных спеваў: *аднагалосыя і шматгалосыя*. Найбольш распаўсюджанымі у свяце з'яўляюцца спевы аднагалосыя. Гэта звычайна абрадавыя песні, якія выконваюцца адным спеваком альбо некалькімі ва ўнісон. Тут у наяўнасці толькі адзін напеў, не утвараецца ніякіх сугуччаў. Вельмі важна ў свяце захаваць іх першасную сутнасць: яны тлумачаць абрад, раскрываюць яго сэнс і сімволіку, займаюць падпарадкавальнае месца ў адносінах да абрадавай дзеі. Меладычны пачатак аднагалосых народных песень заснаваны на мелодыі, якой уласціва лінеарнасць, г.зн. паслядоўная змена вышыні гукаў, у выніку чаго ўтвараецца напеў. Аднагалосыя спевы ўласцівы таксама многім лірычным, жартоўным песням і творам, якія спяваюць у народзе «абы-калі». Некаторыя недаацэньваюць значэнне спеваў ва ўнісон, лічаць іх занадта простымі, а часам і «прымітыўнымі». На самай справе авалоданне ўнісоннымі спевамі – сведчанне высокага майстэрства выканання. Вельмі разнастайная рытміка і кампазіцыйная пабудова аднагалосых каляндарных і сямейна-абрадавых песень. Найбольш поўная аднагалосая манера выканання захавалася на Поўначы Беларусі, у Паазер'і.

Даволі распаўсюджаны тып шматгалосых спеваў – *антыфонныя*, якія ўзнікаюць тады, калі фальклорны твор выконваецца па чарзе двума харамі альбо салістам і хорам. Гэтыя спевы старажытныя па паходжанні, яны звязаны з містэрыяй старажытнагрэчаскай трагедыі, дзе хор падзяляўся на два паўхары, якія спявалі па чарзе. Тэрмін «антыфон» азначае голас, гук, які гучыць у адказ. Песенны дыялог у калядных і валачобных песнях хора і саліста з'яўляецца прыкладам антыфону. Пры гэтых спевах атрымліваецца быццам спаборніцтва паміж салістам і хорам, што знаходзіць адлюстраванне ў карагодных песнях, дзе хлопцы і дзяўчаты (карагод «Проса») спяваюць і рухаюцца разам насустрач адзін аднаму, а потым разыходзяцца. Антыфонныя спевы ўласцівы многім вясельным, жніўным песням. У святах календарных і сямейна-абрадавых антыфонная манера спеваў вельмі распаўсюджана, яна ўносіць элемент эстэтыкі ў абрадавае дзеянне, аказвае станоўчае ўздзеянне на ўспрыняцце гледачоў.

Антыфонныя спевы ўзнікаюць таксама пры выкананні веснавых песень – заклічак living рознымі гуртамі ў розных месцах, што можна выкарыстоўваць у свяце «Гуканне вясны» як рэжысёрскі прыём пры распрацоўцы мізансцэн, размешчаных у розных кропках натуральнага асяроддзя, дзе і пачынаецца свята, а потым выканаўцы з песнямі рухаюцца на цэнтральную пляцоўку. Цікава што абрадавыя песні, апрача эстэтыкі народных спеваў, утрымліваюць і «рэжысуру» абрадавых дзей.

У святах можна пачуць і *дыяфонныя* спевы. Гэта ранні від поліфаніі, які ўзнікае на бурдоннай аснове. Тэрмін «бурдон» французскага паходжання азначае густы бас, голас, які цягнецца бесперапынна і не змяняецца па вышыні. Прыкладам дыяфонных спеваў з'яўляюцца многія купальскія песні («Ой, рана на

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

Йвана»), калі на аснове антыфонных спеваў два гурты спяваюць па чарзе на фоне доўгага гуку (бурдона). Дыяфонная манера спеваў утвараецца таксама пры суправаджэнні выканання музычнымі інструментамі – дудой ці лірай з іх бурдоннымі гукамі.

На Полаччыне сустракаюцца спевы па прынцыпе кананічнай імітацыі напеву рознымі галасамі ці групамі выканаўцаў, якія па чарзе спяваюць мелодыю. Выканаўцы такіх спеваў паўтараюць мелодыю вядучага голасу, уступаючы раней, чым гэта мелодыя скончыцца ў папярэдняга. Звычайна імітацыя народнай песні складаецца з двух галасоў з інтэрвалам паміж імі ў прыму. Трэба канстатаваць, што дыяфонная манера спеваў мае абмежаванае ўзнаўленне ў свяце. Магчыма, справа ў тым, што гэта манера спеваў недастаткова ўжываецца ў творчай дзейнасці фальклорных калектываў.

Яшчэ больш абмежаванае выкарыстанне ў свяце мае народная манера спеваў – *з «пералівамі»*. Яны ўзніклі на аснове ўнісонных групавых спеваў у выніку адхілення асобных галасоў ад асноўнага напеву і стварэння гетэрафонных спалучэнняў гукаў. Тэрмін «спевы з пералівамі» запазычаны ў навуковую тэрміналогію з народнага аяроддзя. Тэрмін «гетэрафонія» паходзіць ад грэчаскага і азначае іншы, другі гук.

Гетэрафонны стыль выканання ўжо існаваў у старажытных грэкаў. Узнікненне гетэрафоніі як спецыфічнай шматгалосай манеры спеваў тлумачыцца натуральнымі адрозненнямі паміж чалавечымі галасамі, а таксама выканаўчай фантазіяй удзельнікаў творчага працэсу. У беларускай народнай песеннай традыцыі гетэрафонія ўяўляе сабой у асноўным эпізадычнае адхіленне голасу ці галасоў ад асноўнай мелодыі. Менавіта гэтыя адхіленні ствараюць так званыя пераліvы. Спевы з «*пералівамі*» распаўсюджаны ў Магілёўскай вобласці і на Ўсходнім Палессі. Яны вызначаюцца яскравым поліры́тмічным малюнкам меласу, якія абумоўлівае багатую арнаментаваную мелодыку. Даволі распаўсюджаны ў свяце народныя спевы з «*падводкай*». Пры гэтых спевах вельмі важна, каб быў моцны ніжні голас, які ўтварае фундамент для «падгалоска». Імправізацыя характэрна для ніжняга і верхняга галасоў, але для «падводкі» гэта галоўная ўмова і паказчык творчага майстэрства. Асноўная мелодыя песні гучыць заўсёды ў ніжнім голасе, які выконваюць па народнай тэрміналогіі «басы» (4, 5 чалавек). Спевы з «падводкай» вельмі маляўнічая манера спеваў. Пры якой асабліва важны верхні голас «падводка». Яго выканаўца павінен валодаць майстэрствам імправізацыі, моцным голасам, выканаўчымі прыёмамі, як «закідванне» гуку ўверх і заканчэнне песні глісанда. Наступная манера спеваў вызначаецца як *голасныя* спевы. Яны распаўсюджаны на Поўдні Беларусі. Гэтыя песні распеўныя па сваёй будове, выконваюцца вясной і летам. Яны разлічаны на выкананне ў лесе, на лузе, на рацэ. Для голасных песень уласцівы доўгія гукі, ферматы, воклічы «Гу!» ў веснавых песнях, глісанда і інш. Выканаўца голасных песень быццам зачаравана слухае сябе і тыя адгалоскі, якія ўзнікаюць пры спевах веснавых і жніўных песень.

*Двухгалосыя* спевы – адны з самых распаўсюджаных у свяце. Яны існуюць у выкананні двух і болей спевакоў. У гэтым тыпе выканання другі голас выступае ў якасці ўторы да першага. Звычайна ўтора гучыць на тэрцыю вышэй вядучага голасу. Пры двухгалосых спевах ніжні голас з'яўляецца асноўным носьбітам мелодыі, а верхні падтрымлівае яго, уторыць яму. Сустракаецца ўтора і на кварту, квінту, сэксту, актаву, аднак у такім выпадку яна носіць эпізадычны характар. У параўнанні з іншымі традыцыйнымі спевамі двухгалоссе ўзнікла пазней. Як правіла, на два галасы спяваюць пазаабрадавыя песні – лірычныя, бяседныя, так званыя «жорсткія» рамансы і інш. Пабудова меладычнага матэрыялу ў двухгалоссі адбываецца ў гарманічна-вертыкальным напрамку.

*Трохгалосыя* спевы таксама даволі распаўсюджаны тып выканання ў свяце. Яны ўзнікаюць у тым выпадку, калі трэці голас запаўняе пустую квінту. Пры выкананні трохгалоссем утвараюцца розныя акордавыя спалучэнні: трохгуччы, сэкстакорды, квартсэкстакорды і інш. У аснове сваёй трохгалоссе носіць эпізадычны характар.

*Чатырохгалоссе,* якое сустракаецца ў свяце, узнікае ў выніку далучэння да жаночых галасоў мужчынскіх: высокіх тэнараў і нізкіх басоў. Як вядома, па сваёй прыродзе мужчынскія галасы гучаць актавай ніжэй пры спевах ва ўнісон з жаночымі галасамі. Пры змешаных агульных спевах жанчын і мужчын натуральна ўзнікае чатырохгалоссе: сапрана дубліруецца тэнарамі, а альты – басамі, адпаведна на актаву ніжэй. Трэбы адзначыць, што пры ўтварэнні чатырохгалосся ў натуральных умовах яго спецыфіка адрозніваецца ад класічнага акадэмічнага выканання з агульна прынятымі законамі пабудовы і развіцця меладычнага матэрыялу.

Аўтар, працуючы мастацкім кіраўніком народнага фальклорнага калектыва «Крынічанька» Рудзенскага ГДК Пухавіцкага раёна больш 15 год, разам з удзельнікамі займаецца засваеннем усіх адзначанных вышэй манер народных спеваў, за выключэннем толькі спеваў з «пералівамі». Гэтыя спевы не атрымалі практычнага ўвасаблення ў творчай дзейнасці мясцовых носьбітаў традыцыі, людзей старэйшага і сярэдняга ўзросту. Звычайна на свяце Каляды ўдзельнікі выконваюць песні ў аднагалосай і антыфоннай манеры спеваў, на Гуканне вясны – ў голаснай манеры, на Купалле – ў дыяфоннай манеры, на іншых святах спяваюць двухгалосыя, трохгалосыя, чатырохгалосыя, нарэшце, выконваюць спевы з «падводкай». Калектыў «Крынічанька» з'яўляецца традыцыйным, многія творы з яго рэпертуару апублікаваны аўтарам [1]. Вельмі пажадана, каб у святах прымалі ўдзел менавіта калектывы традыцыйныя, якія яшчэ памятаюць многія абрадавыя песні і могуць узнаўляць у практычнай дзейнасці розныя манеры аўтэнтычных народных спеваў. Удзел гэтых калектываў у свяце надаюць яму непаўторнае аблічча, рэгіянальную адметнасць, традыцыйнасць. Трэба мець на ўвазе, што ў наш час дзейнічаюць, асабліва ў гарадах, маладзёжныя фальклорныя калектывы, якія ў творчай дзейнасці арыентуюцца на традыцыйнае выканальніцтва, імкнуцца пераняць майстэрства народных спеваў ад непасрэдных

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

носьбітаў традыцыі. Аўтар вызначае творчы накірунак іх дзейнасці як *другасны* фальклор [2, с.437 – 438].

Зразумела, што ў свяце прымаюць удзел фальклорныя калектывы з рознымі творчымі накірункамі ў выкарыстанні народнай манеры спеваў і адпаведнасці яе песеннай першакрыніцы. Паколькі песенны фальклор вызначае самабытнасць свята, то важна каб яго выкананне раскрывала багацце аўтэнтычнай народный манеры спеваў. Якраз умовы свята дазваляюць ажыццявіць гэту высокародную задачу.

**Спіс літаратуры:**


1. Аляхновіч, А.М. Беларуская традыцыйная музычная спадчына / А.М. Аляхновіч. – Мінск : Беларусь, 2000. – 384 с.
2. Аляхновіч, А.М. Другасны фальклор / А.М. Аляхновіч // Беларускі фальклор : энцыкл. – Мінск : Бел. энцыкл., 2005. – Т.1. – С. 437–438.
3. Аляхновіч, А.М. Гурт / А.М. Аляхновіч // Культура Беларусі : энцыкл. / рэдкал.: Т.У.Бялова (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларус. энцыкл. імя П.Броўкі, 2012. – Т. 3. – С. 312.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ